ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ
імя К. КРАПІВЫ

УДК 398(476)

Казакова Ірына Валер'еўна

# МІФАЛАГІЧНА-ФАЛЬКЛОРНАЯ СПЕЦЫФІКА БЕЛАРУСКАЙ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

10.01.09. – фалькларыстыка

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне
вучонай ступені
доктара філалагічных навук

Мінск – 2000

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана ў Інстытуце ма... фальклору імя К.Крапівы Нацыянальн...

Афіцыйныя апаненты:

доктар філалагічных навук, прафесар Гацак В.М.
(Інстытут сусветнай літаратуры імя М.Горкага
Расійскай акадэміі навук, аддзел фальклору)

доктар філалагічных навук, прафесар Кабашнікаў К.П.

доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік
НАН Беларусі Каваленка В.А.

*20504287*

Апаніруючая арганізацыя – Інстытут рускай літаратуры (Пушкінскі дом) Расійскай акадэміі навук, г. Санкт-Пецярбург

Абарона адбудзецца 1 чэрвеня 2... пасяджэнні Савета Д 01.42.01 па абароне дысе... ступені доктара навук пры Інстыту... фальклору імя К.Крапівы НАН Белар... к.2. Тэлефон вучонага сакратар...

С дысертацыяй можна азнаём... навуковай бібліятэцы імя Я.Коласа НАН Беларусі.

Аўтарэферат разасланы 24 красавіка 2000 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый В.М.Бялявіна

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Актуальнасць тэмы дысертацыі

У апошнія гады праблемы міфалогіі прыцягваюць ўсё больш увагі даследчыкаў. Абумоўлена гэта перш за ўсё іх нераспрацаванасцю, наяўнасцю вялікага аб'ёму крыніц, добрай захаванасцю многіх міфалагем, асабліва ў беларускай народнай творчасці, і сучаснай арыентацыяй грамадства на духоўныя агульначалавечыя каштоўнасці, што захаваліся ў нацыянальнай культуры, падмуркам якой з'яўляецца менавіта міфалагічнае светабачанне. Актуальнасць і важнасць даследавання міфолага-фальклорнай спецыфікі традыцыйнай культуры тлумачацца надзвычайнай жывучасцю міфалагічнай свядомасці, што выразна адбілася ў творах розных жанраў і відаў фальклору. Гістарычны лёс народаў-этнасаў звычайна складаецца з некалькіх своеасаблівых этапаў іх фарміравання, кансалідацыі, развіцця, часам заняпаду ці трансфармацыі і зноў адраджэння. Кожны з гэтых этапаў захоўваецца ў народным жыцці, у народнай культуры. Фальклор у сваіх адносна развітых жанрах быў і застаецца гістарычна першай формай выяўлення народнай свядомасці і чалавечай духоўнасці наогул. Менавіта міфалогія, абрады, фальклор фарміравалі культурную традыцыю, архетыпы этнічнай свядомасці і этнапсіхалогіі. Міфалогія, як першы светапогляд чалавецтва, міфалагічная свядомасць, як першапачатковы спосаб асваення свету, як асаблівая сімвалічная сістэма, у тэрмінах якой нашы продкі тлумачылі свет, праяўляецца менавіта ў фальклоры, асабліва ў фальклорным абрадзе, сінкрэтычным паводле сваёй прыроды. Міфалагічнае мысленне не адмерла, яно жыве і сёння ў нашай падсвядомасці, рэлігіі, мастацтве і нават у навейшых дасягненнях навукі.

Даследаванне міфолага-фальклорнай спецыфікі беларускай традыцыйнай культуры прадугледжвае зварот да шырокага кола праблем, актуальных і важных для фалькларыстыкі, культуралогіі, для разумення асаблівасцей нацыянальнай культурнай спадчыны беларусаў, яе месца ў кантэксце сусветнай культуры чалавецтва.

### Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі

Тэма дысертацыі была зацверджана на пасяджэнні Вучонага савета Інстытута мастацтвазнаўства этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі 6 мая 1996 года (пратакол №3) і адпавядае праграме, якая распрацоўваецца па дзяржаўнаму плану Інстытутам МЭФ імя К.Крапівы «Культурная спадчына Беларусі: шляхі развіцця нацыянальных традыцый і сучасны стан мастацтва (Культурная спадчына)». Па гэтай праграме ўжо выдадзены шэраг кніг, у тым ліку і па міфалогіі (А.М.Ненадаўцам, а таксама аўтарам дысертацыі).

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


**Мэта і задачы даследавання**

Мэтай дысертацыйнай работы з'яўляецца сістэмнае даследаванне зместу і міфалагічна-фальклорнай спецыфікі беларускай традыцыйнай культуры. Гэтая мэта дасягаецца пры вырашэнні наступных задач:

– вычленіць, сістэматызаваць, асэнсаваць змест, структуру і функцыянальнасць істотных аспектаў міфалагічнага мыслення, зашыфраваных у фальклорнай творчасці, раскрыць іх этнічную адметнасць і сувязь з сусветнай культурнай традыцыяй;

– ажыццявіць крытычны гістарыяграфічны аналіз важнейшых тэарэтычных даследаванняў, выпрацаваць аўтарскую канцэпцыю асаблівасцей міфалагічных уяўленняў беларусаў;

– даследаваць функцыянальнасць магіі ў традыцыйнай беларускай культуры;

– вызначыць гнасеалагічныя і рэлігійныя дэтэрмінанты старажытнай фальклорнай спадчыны для рэканструкцыі міфалагічнага светапогляду;

– даследаваць семантыку і сімволіку міфалагем, адыграўшых важнейшую ролю ў фарміраванні беларускай міфалагічнай сістэмы;

– ідэнтыфікаваць адметнасці беларускага міфалагічнага светапогляду ў агульнаславянскім кантэксце.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

Аб'ектам даследавання з'яўляецца беларуская традыцыйная культура, як складанаарганізаваная сістэмная цэласнасць духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей этнасу. Прадмет даследавання – семантыка і функцыянальнасць важнейшых міфалагем, адлюстраванне ў фальклоры міфалагічных уяўленняў, сакральных поглядаў, магічных вераванняў беларусаў.

**Метадалогія і метады даследавання**

Распрацоўка ўсіх праблем грунтуецца на вопыце айчыннай і замежнай навукі. Усебакова аналізуюцца тэарэтычныя даследаванні рускіх, беларускіх, заходнееўрапейскіх аўтараў (А.М.Весялоўскага, А.А.Патабні, Б.А.Рыбакова, А.М.Афанасьева, Ф.І.Буслаева, Д.К.Зяленіна, М.Ф.Сумцова, А.К.Кіркора, П.М.Шпілеўскага, М.Я.Нікіфароўскага, В.М.Гацака, А.Л.Тапаркова, А.Ф.Лосева, У.Я.Пропа, К.Леві-Строса, Л.Леві-Бруля, Е.М.Меляцінскага, В.М.Півоева, Я.А.Касцюхіна, Ю.Б.Борава, К.Г.Юнга, Э.Мірча, Дж.Фрэзера, А.Галана, Э.Б.Тайлара, У.М.Конана, К.В.Чыстова, М.Еўзліна, К.Хюбнера, Э.Касірэра, С.В.Максімава, А.М.Пыпіна, М.М.Нікольскага, І.К.Цішчанка, А.М.Ненадаўца, В.У.Іванова, У.М.Тапарова, В.Яромінай, Я.Леўкіеўскай).

Тэарэтычнае асэнсаванне матэрыялаў грунтуецца на сістэмным аналізе, неабходнасць выкарыстання якога абумоўліваецца велізарнай колькасцю крыніц: шматтысячных фальклорных твораў, змешчаных ў 45-томным зборы беларускай народнай творчасці, у беларускіх, рускіх і ўкраінскіх публікацыях XIX–XX стст., архіўных сховішчах. У даследаванні

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


прымяняецца тыпалагічны гісторыка-культурны і параўнальна-гістарычны метады.

**Навуковая навізна**

Дысертацыя з'яўляецца першым у навуцы сістэмным даследаваннем семантыкі і сімволікі міфалагем як структураўтваральных элементаў беларускай міфалогіі. У гэтай сувязі ўпершыню комплексна даследуецца спалучэнне міфалагічных уяўленняў з магічнымі, вызначаецца функцыяніраванне магіі ў беларускай традыцыйнай культуры. Прапануецца арыгінальная канцэпцыя асаблівасцей міфалагічных уяўленняў, у якой аўтар імкнуўся пазбегнуць аднабаковасці і супярэчлівасці многіх канцэпцый папярэднікаў.

**Практычная каштоўнасць**

Матэрыялы і навуковыя вынікі дысертацыі могуць выкарыстоўвацца на практыцы ў многіх сферах. Перш за ўсё як актуальныя і перспектыўныя для распрацовак у галінах міфалогіі і этналогіі, фальклору, беларусазнаўства, гісторыі культуры, этнасвядомасці, этнапсіхалогіі. Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны для распрацоўкі лекцыйных курсаў як філалагічных (міфалогія, беларусазнаўства, фальклор, гісторыя культуры), так і нефілалагічных факультэтаў (беларусазнаўства, гісторыя беларускай і сучаснай культуры).

Некаторыя палажэнні ўжо практычна скарыстоўваліся самім аўтарам пры распрацоўцы лекцыйнага курса «Беларусазнаўства» для нефілалагічных факультэтаў БДУ і матэрыялаў спецыяльнага курсу «Спецыфіка беларускага абрадавага фальклору» для філалагічнага факультэта БДУ.

Фактычны і ілюстрацыйны матэрыял працы можа выкарыстоўвацца для практычных заняткаў па фальклору са студэнтамі ВНУ.

Манаграфіі, брашуры і артыкулы па тэме дысертацыі знайшлі попыт у выкладчыкаў вышэйшай і сярэдняй школы, якія выкладаюць курс беларусазнаўства, фальклору, этнаграфіі. Асобныя матэрыялы працы могуць быць выкарыстаны для напісання падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па фалькларыстыцы, этналогіі і сумежных спецыяльнасцях.

**Асабісты ўклад дысертанта**

Аўтар работы даследаваў шэраг тэм: спецыфіку беларускага абрадавага фальклору і ролю магіі ў ім; канцэпцыі міфа і міфалогіі ў важнейшых працах вучоных XIX–XX стст.; адлюстраванне этнасвядомасці і этнапсіхалогіі беларусаў у народнай паэтычнай творчасці; семантыку і сімволіку міфалагем; асаблівасці адлюстравання міфалагічных уяўленняў у беларускай традыцыйнай культуры. Даследчыца апублікавала тры манаграфіі, у тым ліку дзве па тэме дысертацыі, шэраг брашур і артыкулаў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Прамежкавыя вынікі дысертацыйнага даследавання абмяркоўваліся

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



на пасяджэннях адзела фалькларыстыкі ў ІМЭФ імя К.Крапівы НАНБ. Асобныя палажэнні даследавання адлюстраваны ў дакладах дысертанта на навуковых канферэнцыях: «Славянскія культуры пасля другой сусветнай вайны» Мінск. 10-11 кастрычніка 1995; Міжнародная навуковая канферэнцыя «Мова–літаратура–культура» Мінск, 22-23 верасня 1998 г., «Этнасацыяльныя і канфесіянальныя працэсы ў сучасным грамадстве» Гродна, 13-15 лістапада 1999 г., і іншых, а таксама ў публікацыях.

**Апублікаванасць вынікаў**

Па тэме дысертацыі апублікавана 2 манаграфіі, 3 брашуры і 8 артыкулаў, у якіх выкладзены ўсе асноўныя палажэнні даследавання. Агульны аб'ём публікацый 429 старонак.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

1. Асэнсаванне канцэпцый семантыкі міфаў, міфалогіі, міфалагем у важнейшых даследаваннях і тэарэтычнае абгрунтаванне арыгінальнай канцэпцыі семантычных асаблівасцей міфалагічнага мыслення, адлюстраванага ў міфах (анімістычнага пачатку, кодавай сімвалізацыі міфічнай свядомасці, метафарызацыі, цеснай сувязі з абрадамі і магіяй, трансфармацыі сюжэтаў і зменлівасці функцый, спецыфічнага адлюстравання рэчаіснасці).

2. Міфалагема, як самастойны структураўтваральны элемент ў беларускай міфалагічнай сістэме, яе месца і функцыянальнасць у фальклоры.

3. Роля магіі і яе асобных відаў у міфалагічным мысленні, адлюстраваным у фальклорных творах і народных абрадах.

4. Даследаванне семантыкі міфалагем Зямлі, Сонца,Поўні, Жанчыны, Прыгажосці, Долі (Лёсу), Эротыкі шляхам аналізу пераважна беларускіх абрадаў і абрадавай паэзіі, пазаабрадавых твораў.

5. Асаблівасці беларускай касмалогіі. Макракосмас і мікракосмас, жанчына як цэнтр космасу; роля жаночага полу ў светапогляднай сістэме старажытных людзей.

6. Сімволіка міфалагем у знакавай сістэме народнага мастацтва.

7. Перспектыўнасць даследавання міфалогіі для вывучэння светапогляду народа, вытокаў культуры, фарміравання самасвядомасці і нацыянальнага менталітэту.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, трох раздзелаў, заключэння, спіса скарыстанай літаратуры. Агульны аб'ём дысертацыі 200 старонак, спіс скарыстанай літаратуры змяшчае 360 назваў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва уводзінах вызначаецца агульны накірунак даследавання. Падкрэсліваецца важнасць вывучэння спецыфікі міфалагічнай свядомасці,

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


якая адлюстравалася ў народнай паэтычнай творчасці ў мінулым і на сучасным этапе, даследавання самай старажытнай часткі фальклору. Адзначаецца роля міфалогіі, фальклору, асабліва абрадаў і абрадавай паэзіі, у фарміраванні культурнай традыцыі, архетыпаў этнічнай свядомасці.

У агульнай характарыстыцы дысыртацыйнай работы раскрываюцца: актуальнасць тэмы, сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі, мэты і задачы даследавання, аб'ект і прадмет даследавання, метадалогія і метады даследавання, навуковая навізна і практычная каштоўнасць работы, асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону, асабісты ўклад саіскальніка, апрабацыя вынікаў даследавання і іх апублікаванасць, структура і аб'ём дысертацыі.

Першая глава дысертацыі – **«Канцэпцыі міфа ў важнейшых даследаваннях славянскай міфалогіі»** – змяшчае агляд навуковых прац, у якіх разглядаюцца праблемы, што даследуюцца намі з пункту гледжання ступені канцэптуальнай распрацаванасці тэорыі міфа, міфалогіі, міфалагемы. Навуковае даследаванне і распрацоўка канцэпцыі могуць ажыццяўляцца толькі на базе аналізу папярэдніх навуковых дасягненняў. У гэтай главе падводзяцца вынікі разгляду канцэпцыі семантыкі міфаў, міфалагем і міфалогіі і прапануецца наша разуменне канцэптуальных асноў міфалагем і міфалогіі наогул, якое грунтуецца на семантычных асаблівасцях міфалагічнага мыслення, адлюстраванага ў міфах і традыцыйных фальклорных творах.

Перш за ўсё адзначаецца супярэчлівасць у азначэнні тэрміна *міф* рознымі даследчыкамі (А.Ф.Лосевым, В.М.Півоевым, Я.А.Касцюхіным, Ю.Б.Боравым і інш.). Найбольш прыдатным аўтар лічыць дэфініцыю міфа і міфалогіі Я.А.Касцюхіна: «1) сістэма архаічных уяўленняў аб сусвеце, выражаных у канкрэтна-пачуццёвай форме; 2) апавяданні, якія ўвасобілі гэтыя ўяўленні. Сукупнасць таго і другога называецца міфалогіяй».[1]

Коратка характарызуюцца канцэпцыі міфа і міфалогіі ў працах Ф.І.Буслаева, А.М.Афанасьева, А.А.Патабні, А.М.Весялоўскага, паказваецца значэнне іх даследаванняў для сучаснай навукі: без выкарыстання навуковай спадчыны немагчыма вывучэнне ўзаемасувязей міфалогіі з язычніцтвам, паэтыкі фальклорных твораў, семантыкі міфалагем і інш. Пры разглядзе адзначаных прац выкарыстана кніга Л.А.Тапаркова «Тэорыя міфа у рускай філалагічнай навуцы XIX стагоддзя» (1997) .

Разглядаецца анімістычная тэорыя паходжання рэлігіі і яе праекцыі на пазнейшыя рэлігійныя культы А.Б.Тайлара («Першабытная культура»,

---

1 Восточно-славянский фольклор: Словарь научной и народной терминологиимпак – Мн.: Наука и техника, 1993. С. 150.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


выяўлення іх этнічнай і лакальнай прыналежнасці, для вывучэння некаторых пытанняў этнічнай гісторыі беларускага народа, асаблівасцей яго этнасвядомасці і этнапсіхалогіі, яго культурных сувязей з іншымі народамі [143; 62-63, 73-74, 87, 113, 124-127, 149-151, 176].

7. Аналіз толькі часткі міфалагем сведчыць, наколькі перспектыўнае даследаванне недастаткова вывучанай важнай галіны духоўнай культуры народа, якая не страціла свайго значэння і ў сучаснасці. Міфалагічна-фальклорная творчасць на архаічнай стадыі развіцця культуры займала дамінантнае месца і ў далейшых этнічных працэсах, у фарміраванні нацыянальнай ментальнасці адыгрывала рашаючую ролю. Заканамернасці дынамічнага развіцця культуры немагчыма пазнаць без даследавання фальклорных традыцый; больш таго, плённае ўсебаковае вывучэнне сучасных духоўных працэсаў магчыма толькі шляхам грунтоўнага аналізу падмурку традыцыйнай культуры – архаічных форм народнай творчасці, у якіх захаваліся адбіткі міфалагічнай свядомасці нашых продкаў. Вечна жывыя фальклорныя традыцыі ўплывалі на фарміраванне беларускай нацыі, сучаснай нацыянальнай самасвядомасці, развіццё мастацтва і літаратуры. Менавіта паскоранае развіццё беларускай літаратуры адбывалася галоўным чынам пад уплывам фальклору, роля якога як жыватворчай крыніцы для прафесійнага мастацтва і літаратуры захавалася і зараз [140, 3-4, 76-77; 143, 9-10, 202].

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## Спіс апублікаваных работ па тэме дысертацыі

### Манаграфіі

1. Казакова І.В. Міфалагемы і магія ў беларускім абрадавым фальклоры. – Мн.: БОФФ, 1997. – 120 с.

2. Казакова І.В. Сімволіка і семантыка славянскіх міфалагем (на матэрыялах беларускага фальклору). – Мн.: БОФФ, 1999. – 203 с.

### Артыкулы і брашуры

3. Казакова І.В. Народная творчасць ў фарміраванні этнасу беларусаў // Весці АНБ. Серыя грамадскіх навук. – 1995. – № 1. – С. 71-76.

4. Казакова І.В. Спецыфіка этнічных стэрэатыпаў паводзін жанчын у старажытным рытуале // Беларуская мінуўшчына. – 1996. – № 2. – С. 75-78.

5. Казакова І.В. Магічныя вераванні, як аснова міфалагічнага мыслення ў фальклоры // Славянская культура: гістарычны вопыт, сучасныя праблемы. – Мн.: ПаліБіг. – 1996. – С. 147-158.

6. Казакова І.В. Адметная з'ява ў духоўнай культуры беларусаў // Славянскія культуры пасля другой сусветнай вайны. – Мн.: ПаліБіг. – 1996. – С. 180-183.

7. Казакова І.В. Магія продкаў нашых // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 1. – С. 77-88.

8. Казакова І.В. Ідэалы прыгажосці жанчыны ў народнай эстэтыцы // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 1998. – № 1. – С. 81-85.

9. Казакова І.В. Міфалагічныя ўяўленні беларусаў у калядных і валачобных песнях // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 1999. – № 1. – С. 92-97.

10. Казакова І.В. Скарбонка міфалагічнай архаікі // Полымя. – 1999, – № 11. – С. 205-210.

11. Казакова І.В. Беларуская народная спадчына. – Мн.: БОФФ, 1996. – 12 с.

12. Казакова І.В. Метадычныя рэкамендацыі па курсу «Беларусазнаўства» (з гісторыі культуры). – Мн.: ПК ООО «Вестпрынт», 1996. – 20 с.

13. Казакова І.В. Спецыфіка беларускага абрадавага фальклору. – Мн.: БОФФ, 1996. – 27 с.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## РЭЗЮМЭ

Казакова Ірына Валер'еўна

Міфалагічна-фальклорная спецыфіка беларускай традыцыйнай культуры

Ключавыя словы: міфалогія, міфалагема, фальклор, магічныя вераванніі, нацыянальная спецыфіка, традыцыйная культура, этнічная свядомасць.

Аб'ектам даследавання з'яўляецца беларуская традыцыйная культура, як складанаарганізаваная сістэмная цэласнасць духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей этнасу.

Прадмет даследавання – семантыка і функцыянальнасць важнейшых міфалагем, адлюстраванне ў фальклоры міфалагічных уяўленняў, сакральных поглядаў, магічных вераванняў беларусаў. Даследаванне грунтуецца на метадзе сістэмнага аналізу, з прымяненнем таксама тыпалагічнага гісторыка-культурнага і параўнальна-гістарычнага метадаў. Дысертацыя з'яўляецца першым у навуцы сістэмным даследаваннем семантыкі і сімволікі міфалагем як структураўтваральных элементаў беларускай міфалогіі. У гэтай сувязі ўпершыню комплексна даследуецца спалучэнне міфалагічных уяўленняў з магічнымі, вызначаецца функцыяніраванне магіі ў беларускай традыцыйнай культуры. Прапануецца арыгінальная канцэпцыя асаблівасцей міфалагічных уяўленняў беларусаў. Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць выкарыстоўвацца ў навуковай і вучэбна-метадычнай рабоце ў галіне традыцыйнай народнай культуры.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## РЕЗЮМЕ

Казакова Ирина Валерьевна
Мифолого-фольклорная специфика белорусской традиционной культуры.

Ключевые слова: мифология, мифологема, фольклор, магические верования, национальная специфика, традиционная культура, этническое сознание.

Объектом исследования является белорусская традиционная культура, как сложноорганизованная системная целостность духовных и материальных ценностей этноса.

Предмет исследования – семантика и функциональность важнейших мифологем, отражение в фольклоре мифологических представлений, сакральных взглядов, магических верований белорусов. Исследование базируется на методе системного анализа, с применением также типологического историко-культурного и сравнительно-исторического методов. Диссертация является первым в науке системным исследованием семантики и символики мифологем как структурообразующих элементов белорусской мифологии. В этой связи впервые комплексно исследуется соотношение мифологических представлений с магическими, определяется функционирование магии в белорусской традиционной культуре. Предлагается оригинальная концепция особенностей мифологических представлений белорусов.

Материалы диссертационного исследования применимы в научной и учебно-методической работе в области традиционной народной культуры.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


**SUMMARY**

Kazakova Irina Valerjevna

Mythologic-folklore specifics of Belarusian traditional culture.

Key words: mythology, mythologem, folklore, magic beliefs, national specifics, traditional culture, ethnic consciousness.

The object of research is Belarusian traditional culture, as a compound organized system integrity of spiritual and material values of an ethnos.

The subject of research is semantics and functionality of the most important mythologems, reflected in the folklore of sacral views of magic beliefs of Belarusians. The research is founded on the method of system analysis, combined with typological historical-cultural and relative-history methods. The thesis is the first in the science system research of semantics and symbolics of mythologems, as structure forming Belarusian mythology elements. For the first time the correlation of mythological presentations with magic is researched; operation of magic in the Belarusian traditional culture is defined. Original concept of particularities of mythological presentations of Belarusians is offered.

The materials of the dissertation can be used in scientific and methodical work in the field of traditional public culture.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


Казакова Ірына Валер'еўна

**МІФАЛАГІЧНА-ФАЛЬКЛОРНАЯ СПЕЦЫФІКА БЕЛАРУСКАЙ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ**

10.01.09. – фалькларыстыка

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне
вучонай ступені
доктара філалагічных навук

Падпісана ў друк 12.04.2000 г. Фармат 60х84 1/16
Бумага афсетная № 1. Гарнітура Roman
Ум. друк. л. 2,1. Тыраж 100 экз.
Выдавецтва «БОФФ» 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, к.2.